**Ерашэнка С.А.,**
*аспірант кафедры*
*этналогіі і музеязнаўства*

# КУЛЬТУРА ЗНОСІН: МАГЧЫМАСЦЬ І РЭЧАІСНАСЦЬ

Праблема зносін паміж людзьмі — адна з найбольш складаных комплексных праблем, да вывучэння якой увесь час звяртаюцца даследчыкі розных галін чалавеказнаўства.

Актуалізацыя і павышэнне цікавасці да праблематыкі зносін патрабуе эмпірычных і тэарэтычных ведаў аб працэсах і з'явах, якія суправаджаюць зносіны. "Напэўна,— справядліва адзначае Ю.Д.Прылюк,— тут мы маем справу з адной з тых вузлавых праблем, зварот да якіх (больш ці менш сістэматычны) з'яўляецца правілам, не выключэннем".

Першы ўздым цікавасці да працэсаў зносін у нашым стагоддзі назіраўся ў 50-я—60-я гады. Гэта час, калі ў савецкай навуковай літаратуры "атрымлівае прапіску" кібернетыка. Вывучэнне зносін як сродку абмену інфармацыяй патрабавала фармалізацыі паведамленняў, іх кадзіравання і дэкадзіравання.

Канец 60-х—70-я гады — час росквіту псіхалогіі, лінгвістыкі, семіётыкі — наклаў свой адбітак на вывучэнне зносін. Аўтары нацэлены на разуменне работы "механізма" зносін, выяўленне яго сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцей. Аналізуюцца вербальныя і невербальныя формы зносін, акцэнт робіцца на вывучэнні і апісанні камунікацыйных актаў.

Канец 70-х—пачатак 80-х гадоў — трэцяя хваля цікавасці да камунікатыўнай праблематыкі. Тут намячаецца спроба адыходу ад псіхалогіі лінгвацэнтрызму і робіцца рэзкі паварот да сацыялогіі зносін. Аналіз узаемадзеяння людзей абумоўліваецца неабходнасцю разумення закана-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мернасцей функцыяніравання грамадства, станаўлення і развіцця асобы, неабходнасцю асэнсавання працэсаў управлення і арганізацыі грамадскіх інстытутаў.

Чацвёртая хваля цікавасці даследчыкаў да зносін, якая назіраецца з пачатку 90-х гадоў, прадвызначана своеасаблівым "заняпадам" інфармацыйна-інструментальнай парадыгмы. У літаратуры, арыентаванай на асэнсаванне і супастаўленне поглядаў даследчыкаў з пазіцыямі савецкіх вучоных, яўна намячаецца пераацэнка утылітарысцкіх трактовак зносін, якія дамінуюць у інфармацыйна-інструментальных даследаваннях.

Такім чынам, не будзе перабольшваннем сцвярджэнне аб тым, што праблема зносін канцэнтруе гуманітарную праблематыку ў цэлым, і таму без усебаковага вывучэння феномена зносін немагчыма адэкватна высветліць усе аспекты працэсу станаўлення чалавека як суб'екта сацыяльнай дзейнасці, немагчыма таксама высветліць зыходнае значэнне культуры як асновы творчай самарэалізацыі чалавека.

Актывізацыя навуковых даследаванняў па праблеме зносін адлюстроўвае, на наш погляд, існуючыя глыбінныя працэсы, сутнасцю якіх з'яўляецца эмансіпацыя індывідуальнасці чалавека. Гэтыя працэсы назіраюцца і ў нашай рэспубліцы, дзе адбываюцца змены састарэлых сацыяльных механізмаў і ствараецца новая дэмакратычная супольнасць.

Пошукі магчымасцей прадукцыйных кантактаў, узаемаразумення людзей розных нацыянальнасцей, сацыяльных груп, грамадскіх рухаў становяцца ўмовай выжывання чалавецтва. Уменне ўстанаўліваць сардэчныя зносіны з духоўна блізкімі людзьмі і паважлівыя зносіны з усімі, хто побач, па-ранейшаму застаюцца абавязковай умовай дабрабыту і шчасця кожнага чалавека.

Тое, як людзі абменьваюцца адзін з адным сваімі думкамі і пачуццямі, залежыць ад аб'ектыўнай сітуацыі, у якой яны жывуць, і ад культурнай традыцыі, якую яны атрымалі ў спадчыну. Культура зносін з'яўляецца адлюстра-

ваннем глыбінных працэсаў развіцця грамадства і паказчыкам духоўнага развіцця асобы.

Бясспрэчна, што праблема культуры зносін і яе выхаванне выходзяць на першы план значнасці для кожнага народа. У залежнасці ад гістарычных і сацыяльных умоў розныя народы прапануюць сваё рашэнне гэтай праблемы, характэрнай толькі для іх этнасу. У той жа час у гэтым рашэнні шмат агульнага з іншымі народамі, нават аддаленымі ў геаграфічным і культурным плане.

Так, з моманту свайго нараджэння дзіця трапляе ў вызначанае культурнае асяроддзе. Культурныя нормы ім засвойваюцца праз прызму той культуры, якая яго акружае. Нарадзіўшыся, дзіця яшчэ толькі "кандыдат у чалавека". У працэсе развіцця яно становіцца членам грамадства. Культурнае асяроддзе, у якое трапляе і ў якім развіваецца дзіця, характарызуецца перш за ўсё асаблівасцямі зносін. Гэтымі асаблівасцямі зносін павінна авалодаць дзіця, каб стаць членам грамадства.

Самыя розныя сацыяльныя інстытуты накіраваны на вырашэнне задач па выхаванні культуры зносін. Вялікую ролю ў выхаванні культуры зносін у традыцыйным грамадстве адыграла рэлігія. У свяшчэнных тэкстах і паданнях гаворыцца аб тым, якіх маральных запаведзей павінны прытрымлівацца вернікі, і паказваюцца прыклады праведных і грэшных паводзін. У старажытнаіндыйскіх "Законах ману", кітайскім трактаце "Лі-цзы" дэталёва рэгламентаваны формы паводзін людзей розных статусаў, узростаў, мужчын і жанчын для розных сітуацый, пры гэтым усе гэтыя формы паводзін выступаюць як канкрэтнае ўвасабленне рэлігійна-філасофскіх прынцыпаў брахманізму і канфуцыянства і з'яўляюцца абавязковымі для вернікаў. У праваслаўных вернікаў святар кантраляваў усё прыватнае жыццё свайго прыходу, раіў, падтрымліваў у цяжкіх жыццёвых сітуацыях і асуджаў за дрэнныя ўчынкі.

Акрамя гэтых, існуюць формы зносін, "прывязаныя" да канкрэтных жыццёвых сітуацый. Так, напрыклад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у многіх афрыканскіх плямёнаў існаваў абрад ініцыяцыі (пасвячэння ў мужчыны), у Кітаі — абрад ахвярапрынашэння ў гонар апошняга кланавага продка. Гэтыя абрады мелі моцнае ўздзеянне на самаўсведамленне чалавека, на замацаванне сацыяльна ўхваленых паводзін.

Ва ўсе часы асаблівая ўвага надавалася выхаванню культуры зносін у прадстаўнікоў кіруючых слаёў грамадства. Выхаванню адпаведных манер садзейнічалі не толькі намаганні бацькоў, настаўнікаў, але і пэўнае сацыяльнае асяроддзе, у якім знаходзіліся прадстаўнікі кіруючых колаў.

Такім чынам, нават беглы позірк на гэтую праблему паказвае яе жыццёва-гістарычную актуальнасць і невычэрпнасць формаў і шляхоў вырашэння.

Старажытныя плямёны і народы вельмі спецыфічна ўяўлялі сабе ўпарадкаванне свету. Яны лічылі, што зямля трымаецца на кітах або чарапахах, на сланах або дэльфінах. З таго, як узнік свет і на чым ён трымаецца, выводзілася яго жыццеўстройванне. Старажытныя мысліцелі, спрачаючыся і памыляючыся, мелі рацыю ў галоўным: ад таго, на чым і як трымаецца зямля, залежаць прынцыпы яе існавання.

Сёння, узбагачаныя навуковымі адкрыццямі, мы можам, спалучаючы навуковую строгасць і мастацкую метафарычнасць, сцвярджаць: зямля трымаецца на традыцыі. Ужо само яе абарачэнне па арбіце ёсць традыцыя. Не менш важнай асновай, на якой трымаецца зямля, з'яўляецца культурная традыцыя.

Добра вядома ўсім, што менавіта праца стварыла чалавека, але, зусім не прэтэндуючы на праўдзівасць у апошняй інстанцыі, бадай, цяжка не пагадзіцца з выказваннем расійскага даследчыка В.Ю.Борава: "Усім сваім каласальным узлётам чалавецтва абавязана менавіта культуры, магчымасці сацыяльнай перадачы інфармацыі. Культура выступае як універсальная сацыяльная памяць, магутная крыніца духоўных сіл народа, якая замацоўвае яго калектыўны і гістарычны вопыт".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння, калі мы разважаем аб адраджэнні беларускай культуры, перш за ўсё думаем аб народнай творчасці, аб пашырэнні яе ролі ў нашым жыцці.

І не выпадкова ў крытычныя моманты ў развіцці нашай культуры мы звяртаемся да фальклору і яго традыцыі. Раней фальклор з'яўляўся важным сродкам духоўнага развіцця народа. Для большасці ён быў фактычна школай і кнігай. Фальклорныя творы перадаюць багаты жыццёвы вопыт народа, яго мудрыя думкі, фарміруюць эстэтычныя і мастацкія густы. Традыцыйныя радзінныя звычаі і абрады беларусаў у канцы 19—пачатку 20 стагоддзя ўяўлялі сабой стройную сістэму, у якой знайшлі адлюстраванне разнастайныя бакі народнай культуры, побыту, філасофіі, рэлігіі, светаўспрымання і светаасэнсавання. Адначасова яны з'яўляліся складанай часткай духоўнай культуры і народнага побыту.

Улічваючы ўсё гэта, на нашу думку, будзе вялікай памылкай не выкарыстоўваць вялікага патэнцыялу тых галін культуры, дзе ёсць непасрэдны кантакт з традыцыйнай народнай творчасцю.

**Гаранец І.М.,**
*аспірантка кафедры рэжысуры свят*

## СВЯТА ЯК АБ'ЕКТ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА АНАЛІЗУ

Культура — з'ява вельмі складаная і разнастайная. Большасць тэарэтыкаў, вызначаючы паняцце "культура", прызнаюць непасрэдную сувязь культуры з прадметна-пераўтваральнай дзейнасцю чалавека. Э.С.Маркаран у кнізе "Тэорыя культуры і сучасная навука" піша: "Узніклая на досвітку чалавечай гісторыі ў якасці спецыфічнага сацыяльнага феномена, унікальнага механізму самазахавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ